Я. А. КРАСУЛІН

# ІЕРАГЛІФІЧНЫЯ ТЭКСТЫ ХРАМА НАДШСАЎ У ПАЛЕНКЕ

Храм Надпісаў у горадзе Паленке, які на пачатку 50-х гадоў мінулага стагоддзя даследаваў мексіканскі археолаг А. Рус, з'яўляецца адным з самых цікавых помнікаў цывілізацыі індэйцаў майя класічнай эпохі.

Па-першае, там была знойдзена некранутая грабніца кіраўніка гэтага горада, якая датуецца VII ст. н. э. і дагэтуль застаецца унікальным адкрыццём у археалогіі майя. Па-другое (але па сваёй важнасці, бадай што, па-першае), у храме быў адкрыты самы доўгі з вядомых нам іерагліфічных тэкстаў майя. Змест тэксту шчыльна зніташаны з асобай чалавека, пахаванага ў грабніцы. Ён змяшчае ў сабе інфармацыю, якая тычыцца папярэдніх кіраўнікоў Паленке, і ўяўляе сабой нешта кшталту «царскага спіса». Дадзены тэкст вельмі важны для нас, таму што ён дазваляе парушыць безаблічнасць гісторыі майя, напоўніўшы яе рэальнымі асобамі.

Можна казаць, што ў храме знаходзяцца два тэксты. Адзін з іх займае тры панелі храма, размешчанага на вяршыні пірамідальнага падмурка, другі - бакавыя грані накрыўкі саркафага ў пахавальным памяшканні. Цэнтральная і заходняя панелі верхняга Храма прысвечаны Пакалю II - кіраўніку Паленке, які, на думку даследчыкаў, пахаваны ў грабніцы Храма Надпісаў. Тэкст усходняй панелі з'яўляецца, па сутнасці, спісам папярэднікаў Пакаля на троне горада. Апавяданне на ёй пачынаецца з юбілейнай даты - канца 4-га катуна 9-га бактуна, - якая прыпадае на часы кіравання персанажа Акаль-Анаб I.

Далей у тэксце пералічваюцца іншыя кіраўнікі, якія займалі трон у ГІаленке пасля Акаль-Анаба I і да ГІакаля II. Падзеі. якія прыгадваюццаў сувязі з імі, абмяжоўваюцца двума тыпамі: даты ўступлення на трон і юбілеі (толькі ў адным месцы, верагодна, прыгадваецца нейкая падзея, знітаваная з баявымі дзеяннямі). Ні нараджэнне, ані смерць кіраўнікоў у дадзеным тэксце не прыгадваюцца. Адсутнасць звестак аб смерці на ўсходняй панелі кампенсуецца інфармацыяй, змешчанай на гранях накрыўкі саркафага. Практычна, адзіная падзея, у сувязі з якой пералічваюцца персанажы на саркафагу, - гэта іх смерць. Толькі двойчы гэтая аднастайнасць парушаецца юбілейнымі датамі - завяршэннямі 7-гаі 10-га катунаў, атаксама асобна стаіць тэкст на паўднёвай грані, дзе, як і на сучасных надмагіллях, пазначаны даты нараджэння і смерці Пакаля II. Гэтае вынясенне датаў смерці з тэксту верхняга храма ў грабніцу не падаецца выпадковым. Паведамленне аб смерці перанесена ў тое месца, якое не належыць зямным справам, з'яўляючыся часткай замагільнага свету.

Тэкст накрыўкі саркафага таксама пачынаецца з імя Акаль-Анаба I. 3 гэтым кіраўніком знітавана самая ранняя дата на саркафагу, пасля якой усе падзеі падаюцца ў храналагічным парадку, да самай позняй даты, якая змяшчаецца на паўднёвай грані. Таму было б лагічным дапусціць, што тэкст трэба чытаць менавіта з усходняй грані, дзе прыгадваецца Акаль-Анаб I, а не з паўднёвай, дзе знаходзіцца дата смерці Пакаля II - самая позняя з усіх.

Калі параўноўваць тэкст усходняй панелі з тэкстам на накрыўцы саркафага, дык можна заўважыць, што ў спісе персанажаў ёсць сходныя моманты, а ёсць і розначытанні. Параўнальны аналіз абцяжараны дрэннай ступенню

захаванасці першай часткі ўсходняй панелі, якая быццам бы адмыслова знішчана. Тым ня менш, можна казаць, што лакуна ў тэксце ўсходняй панэлі адпавядае, судзячы па датах, урыўку тэксту ўсходняй грані накрыўкі саркафага - паміж Акаль-Анабам I і Гаспадыняй Наль-Ік'аль. У гэтым месцы прыгадваюцца тры персанажы - К'ан-Тул-Шул, Акаль-Анаб II і Чан-Бол I. Супадзенні працягваюцца да прыгадвання Ах' Чакх'аля на паўночнай грані. На заходнім баку прыгадваюцца тры персанажы, якіх няма ў тэксце верхняга храма. Першым з іх ідзе яшчэ адзін кіраўнік, чыё імя гучыць як Пакаль (Пакаль і), які памёр у 612 г., а потым - Гаспадыня Сак К'ук' і К'ан-Мо-Бол. Такім чынам, мы бачым, што гэтыя тэксты дапаўняюць адзін аднаго.

Разгляд тэксту на гранях накрыўкі саркафага дазваляе зрабіць вывады наконт таго, зыходзячы з якіх прынцыпаў пісец майя размяшчаў на ёй іерагліфічныя знакі. Складаецца ўражанне, што надпіс на паўднёвай грані нанесены больш акуратна і больш дасведчанай рукой, чым надпісы на астатніх гранях. Цікава адзначыць таксама розніцу ў кампаноўцы іерогліфаў наўсходняй, паўночнай і заходняй гранях. Першыя тры іерогліфы на ўсходнім баку напісаны дастаткова свабодна, але потым надпіс пачынае ўшчыльняцца, так што іерогліфы лепяцца адзін да. аднаго - да даты канца 7-га катуна, якая зноў напісана даволі выразна. Потым - ізноў «сціскание», і толькі апошні іерогліф, які пазначае імя Гаспаяыні Наль-Мк'аль, нават крыху расцягнуты, каб заняць рэшткі месца на гэтай грані.

У адрозненне ад усходняй грані, усе іерогліфы грані паўночнай выяўлены так, каб заняць як мага болей месца. I надпіс на заходнім баку таксама пачынаецца з «расцягнутых» іерогліфаў, і толькі ў сярэдзіне пісец, нібыта спахапіўшыся, пачынае іх пакрысе «падціскаць». Увогуле, складаецца ўражанне, што надпіс выконваўся ва ўмовах недахопу часу, калі пісцы не мелі магчымасці акуратна размясціць тэкст. Ці, як варыянт, некаторыя іерогліфы былі нанесены на накрыўку раней, як, напрыклад, юбілейная дата завяршэння 7-га катуна, а потым, на тое месца, якое засталося, нанасіліся астатнія знакі. Усё гэта можа сведчыць аб тым, што надпіс, па меншай меры часткова, нанасіўся пасля смерці Пакаля, ягоным пераемнікам Чан-Болам, паколькі сам Пакаль, калі б «пахавальны інвентар» рыхтаваўся пад ягоным наглядам, прасачыў бы за акуратнасцю нанясення іерагліфічных знакаў.

Тая ж праблема прысутнічае і пры вывучэнні тэкстаў верхняга храма. Прыгадванне Чан-Бола на заходняй панелі сведчыць аб тым, што яна стваралася ўжо пасля смерці Пакаля. У такім выпадку паўстае пытанне - навошта Чан-Болу трэба было так упарта пісаць аб сваім папярдніку. Адказам можа быць тое, што Пакаль заняў трон у ГІаленке не зусім законным чынам, і ягонаму пераемніку давялося прыкладаць шмат высілкаў да таго, каб легітымізаваць сваю ўладу.